**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**Вучэбна-метадычнае аб'яднанне па гуманітарнай адукацыі**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
А.І. Жук
29.12.2012
(дата зацвярджэння)

Рэгістрацыйны № ТД-E.496/тып.

# ЛІНГВІСТЫКА ПУБЛІЦЫСТЫЧНАГА ТЭКСТУ

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для ўстаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці:**

1-23 01 10-02 Літаратурная работа (рэдагаванне)

**УЗГОДНЕНА**
Намеснік Міністра інфармацыі
Рэспублікі Беларусь
У. У. Матусевіч
17.05.2012г

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Упраўленя вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
С. І. Раманюк
29.12.2012

Старшыня Вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі
У. Л. Клюня
15.05.2012

Прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы"
В. І. Шупляк

**Эксперт-нормкантралёр**
Т.П. Заяц
26.11.2012

Мінск 2012

СКЛАДАЛЬНІК:
В.І. Іўчанкаў, загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

Кафедра беларускага мовазнаўства Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка";

А.А.Лукашанец, дырэктар філіяла "Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы" дзяржаўнай навуковай установы "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі", член-кар. Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:
Кафедрай стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 10/11-12 ад 16.03.2012);

Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

(пратакол № 4 ад 30.03.2012);

Навукова-метадычным саветам па журналістыцы Вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі
(пратакол № 5 ад 10.04.2012)

Адказны за рэдакцыю: В.І.Іўчанкаў

Адказны за выпуск: М.Г. Екацярынечава

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма па дысцыпліне “Лінгвістыка публіцыстычнага тэксту” распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта па спецыяльнасці 1-23 01 10 “Літаратурная работа (па напрамках)”.

*Характарыстыка вучэбнай дысцыпліны.*

Выкладанне дысцыпліны “Лінгвістыка публіцыстычнага тэксту” забяспечвае асэнсаванне студэнтамі моўнай арганізацыі журналісцкага твора з гледжання інтра- і экстралінгвістычнай сутнасці і магчымасцей яго літаратурнай апрацоўкі. Вывучэнне дысцыпліны дазваляе ажыццявіць прынцып узаемазвязанасці і ўзаемаабумоўленасці працы над тэкстам, калі стваральнік публіцыстычнага твора выступае ў дзвюх ролях – і рэдактара, і журналіста. Тэарэтычны матэрыял згрупаваны па шасці асноўных блоках, у якіх падаюцца агульныя і прыватныя характарыстыкі публіцыстычнага тэксту (прызначанасць для масавай аўдыторыі, аператыўнасць, перыядычнасць і рэгулярнасць, дубліраванне і валентнасць зместу, калектыўнае аўтарства, інтэртэкстуальнасць), практычны матэрыял базуецца на разглядзе журналісцкіх (у тым ліку ўласных) матэрыялаў і аналізе класічных твораў.

*Роля і месца дысцыпліны ў прафесійнай падрыхтоўцы.*

Вучэбны прадмет з’яўляецца неабходнай часткай прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў і разлічаны на студэнтаў, якія набываюць кваліфікацыі літаратурнага рэдактара і журналіста. Асноўная ўвага ў змесце курса адводзіцца вызначэнню лінгвістычнай прыроды публіцыстычнага тэксту, жанравай спецыфіцы і сітэмна-структурнай арганізацыі. Яго выкладанне павінна мець планамерны і скіраваны на творчы пошук характар, садзейнічаць засваенню студэнтамі асноў абранай спецыяльнасці, замацаванню тэарэтычных ведаў, набыццю прафесійных навыкаў.

Тэкставая арганізацыя вывучаецца як складаная камунікатыўная з`ява, што ўключае не толькі інтралінгвістычныя фактары пабудовы, а падае даволі разнастайную карціну свету, адлюстроўвае працэс устанаўлення неабходнай сувязі паміж моўнымі выказваннямі (як лінгвістычнымі аб`ектамі) і сацыяльнымі дзеяннямі.

*Сувязі вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі вучэбнага плана.*

Дысцыпліна “Лінгвістыка публіцыстычнага тэксту” вывучаецца студэнтамі спецыяльнасці “Літаратурная работа (рэдагаванне)” пасля таго, як яны атрымалі базавыя веды па дысцыплінах “Сучасная беларуская мова”, “Сучасная руская мова”, “Стылістыка” і маюць агульнае ўяўленне пра гісторыю, задачы і сучасныя метады рэдагавання ў межах дысцыплін “Асновы літаратурна-рэдактарскай дзейнасці”, “Асновы творчай дзейнасці рэдактара” і “Методыка літаратурнага рэдагавання”. Дысцыпліна становіцца грунтоўным падмуркам для вывучэння журналісцкага і рэдакатарскага працэсаў. У аснове навучання – максімальная індывідуалізацыя заданняў,

дэталёвы кантроль і аналіз работ студэнтаў, падрабязныя кансультацыі па ўсіх пытаннях дзейнасці рэдактара.

*Мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны.* Мэта курса – вывучэнне публіцыстычнага тэксту як дыскурсу – складанай камунікатыўнай з'явы, своеасаблівай іерархіі ведаў, "фрагмента жыццёвай прасторы", адлюстраванага ў тэксце.

Дасягненне мэты забяспечваецца рэалізацыяй агульных і прыватных **задач**:

раскрыць прынцыпы і метады лінгвістычнай арганізацыі тэксту, які ўтрымлівае ў сабе экстралінгвістычную інфармацыю, што выражаецца ў мікра- і макрастратэгіях прэзентацыі карціны свету;

выявіць крытэрыі адбору маўленчых сродкаў у тэксце ў адпаведнасці з камунікатыўнай зададзенасцю;

азнаёміць з методыкай дыскурснага аналізу паводле ўстанаўлення сувязі паміж вербальнай камунікатыўнай падзеяй і сацыяльным кантэкстам жыццёвага ўладкавання носьбіта мовы і канцэнтравана – для выяўлення разумення працэсаў вытворчасці і выкарыстання тэксту;

паказаць генетычную звязанасць тэкставай дзейнасці з парадыгматычнай структурыраванасцю, марфалагічнай стратыфікацыяй тэксту, якія з'яўляюцца вызначальнымі ў прэзентацыі "аўтарскага бачання" навакольнага свету;

вызначыць экстралінгвістычныя складнікі арганізацыі, вытворчасці, планавання і праектавання на масавую аўдыторыю тэксту ў рэчышчы тэорыі кагнітыўнай апрацоўкі дыскурса, дзе ілакутыўны акт паўстае як прэзентант "лінгвістычнай карціны свету".

*Патрабаванні да асваення вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам.* У выніку вывучэння дысцыпліны "Лінгвістыка публіцыстычнага тэксту" студэнты павінны

***ведаць:***

– прынцыпы і метады лінгвістычнай арганізацыі публіцыстычнага тэксту;

– метады вызначэння залежнасці моўнай арганізацыі тэксту ад фактараў экстралінгвістычнага парадку;

– асновы дыскурснага аналізу беларускіх СМІ;

– крытэрыі адбору моўных сродкаў пры экстра- і інтралінгвістычнай арганізацыі тэкстаў СМІ;

– дэфінітыўны апарат лінгвістыкі публіцыстычнага тэксту.

***умець:***

– вызначаць экстралінгвістычныя характарыстыкі публіцыстычнага тэксту;

– праводзіць дыскурсны аналіз навінавых тэкстаў;

– ствараць свае тэксты і аналізаваць іх з пункту гледжання правамернасці іх арганізацыі;

– аналітычна прачытваць публіцыстычныя тэксты з пункту гледжання

сукупнасці прадстаўленай у іх інфармацыі і камунікатыўнай зададзенасцю;

– аперыраваць тэрміналогіяй дысцыпліны.

*Характарыстыка метадаў і тэхналогій навучання.* Вывучэнне дысцыпліны забяспечваецца выкарыстаннем наступных метадаў: дыскурснага аналізу, кантэнт-аналізу, дэскрыптыўнага, лексіка-семантычнага, кампанентнага аналізу, семантычнай ідэнтыфікацыі, а таксама прыёмаў статыстычнага і аналізу сацыяльнага, прагматычнага, кагнітыўнага кантэкстаў.

Дыскурсны аналіз прымяняецца з мэтай устанаўлення сувязі паміж вербальнай камунікатыўнай падзеяй і сацыяльным кантэкстам жыццёвага ўладкавання носьбіта мовы (журналіста, пісьменніка) і канцэнтравана – для выяўлення разумення працэсаў вытворчасці і выкарыстання тэксту. Кантэнт-аналіз дазволіць сістэматызаваць, у канкрэтных маўленчых сітуацыях вылучыць дамінантныя кампаненты (кампазіты) і распрацаваць методыку мэтанакіраванага адбору тых тэкставых паказчыкаў, на якіх грунтуюцца канвенцыянальныя веды, правесці інтэрпрэтацыю формы і зместу інфармацыйнай крыніцы. Лексіка-семантычны ў спалучэнні з дэскрыптыўным метадам дазволіць апісаць семную нагрузку аднаго з дамінантных элементаў сememнай парадыгмы тэксту. Ідэнтыфікацыя тэматычнай і гіпера-гіпанімічнай парадыгмы тэксту праводзіцца метадам кампанентнага аналізу. Выкарыстанне прыёмаў аналізу калектыўнага, сацыяльнага і прагматычнага кантэксту дазволіць, па-першае, выявіць канвенцыянальную прыроду кампазіта “характэрнага” для грамадства, па-другое, далучыць да дыскурснага аналізу апісанне скандэнсаваных у памяці чалавека маўленчых сітуацый у працэсе пэўных ілакутыўных актаў.

У навучанні павінен рэалізоўвацца спосаб актыўнага ўзаемадзеяння лекцый з праблемна-пададзеным зместам навучання, у ходзе якога студэнт вучыцца творча засвойваць веды. Праблемнае навучанне выступае альтэрнатывай для эўрыстычнага, калі ставяцца мэты канструявання навучэнцамі ўласнага сэнсу, мэт і зместу адукацыі, а таксама яе арганізацыі, дыягностыкі і ўсведамлення.

Выкарыстоўваюцца тэхналогіі праблемнага, эўрыстычнага навучання і тэхналогія дыдактычнай эўрыстыкі, прымяняецца традыцыйнае і камп’ютарнае тэсціраванне, электронная бібліятэка.

*Рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай працы.* Студэнтам у працэсе вывучэння дысцыпліны рэкамендуецца рэгулярна знаёміцца з айчыннай і замежнай літаратурай, аналізаваць новыя публікацыі па дыскурсным аналізе сродкаў масавай інфармацыі, матэрыялы навукова-практычных канферэнцый па праблемах арганізацыі медыятэкстаў, вучыцца творча прымяняць атрыманыя веды пры напісанні рэфератаў.

*У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны* “Лінгвістыка публіцыстычнага тэксту” па спецыяльнасці 1-23 01 10-02 “Літаратурная работа (рэдагаванне)” адведзена 42 гадзіны, з іх 20 – лекцыйныя заняткі, 22 – практычныя.

У залежнасці ад ступені падрыхтаванасці студэнтаў, іх агульнай эрудыцыі і здольнасці да самастойнага пошуку інфармацыі можна па-іншаму размяркоўваць колькасць гадзін па раздзелах.

Выніковая адзнака фарміруецца на аснове наступных складнікаў:

– работа над заданнямі на практычных занятках (бягучы кантроль);
– рэферат;
– экзамен.

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назва тэмы | Лек-цыі | Практычныя заняткі | Усяго |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Уводзіны. Тэкст. Тэорыя тэксту і лінгвістыка тэксту. Дэфінітыўны апарат апрацоўкі тэксту ў лінгвістычных сферах. Інтэртэкстуальнасць. | 2 | 2 | 4 |
| 2. | Дыскурсны падыход да вывучэння тэкстаў (сцэнарый дыскурснага аналізу тэкстаў-навін). Роля сасюраўскай канцэпцыі ў вызначэнні сутнасці дыскурснага падыходу да вывучэння тэксту. | 2 | 2 | 4 |
| 3. | Праблема вызначэння зместу тэрміна *дыскурс*, яго структуры і залежнасцей. Ад вывучэння мовы ў сацыяльным кантэксце да дыскурснага аналізу. Семантычная кандэнсацыя як акумулятыўны сродак назапашвання ведаў пра ментальнасць народа. | 2 | 2 | 4 |
| 4. | Агульныя анталагічныя і прыватныя экстралінгвістычныя характарыстыкі тэксту. | 6 | 6 | 12 |
| 5. | Лінгвістычная арганізацыя публіцыстычнага тэксту. Выражэнне моўнай асобы ў тэксце. Трапеічная сістэма мастацкага тэксту ў дачыненні да сацыяльнай дзейнасці носьбіта мовы. Вонкавая і ўнутраная структурыраванасць публіцыстычнага тэксту. | 2 | 6 | 8 |
| 6. | Парадыгматыка і сінтагматыка тэксту. Марфалагічная стратыфікацыя публіцыстычнага тэксту. | 6 | 4 | 10 |
| **Усяго гадзін:** | | **20** | **22** | **42** |

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**1. Уводзіны. Тэкст. Тэорыя тэксту і лінгвістыка тэксту. Дэфінітыўны апарат апрацоўкі тэксту ў лінгвістычных сферах. Інтэртэкстуальнасць.**

Станаўленне і развіццё лінгвістыкі публіцыстычнага тэксту – важны гістарычны працэс, які патрабуе абагульнення назапашаных ведаў, цэласнага аналізу асобных з’яў літаратуры, журналістыкі і лінгвістыкі.

Новы падыход да прадукту разумовай дзейнасці чалавека – тэксту: структурнае распазнаванне яго элементаў, кампаноўкі і сістэмнае ўзаемадзеянне вербальнага знака з іншымі знакамі натуральнага свету, вызначэнне прыроды такога ўзаемадзеяння.

Тэкст як з'ява чалавечай дзейнасці, камунікацыі і пазнання. Вербальны тэкст у рэальным камунікатыўным дзеянні, у інтэграцыі з сацыяльна-культурнымі і ідэалагічнымі кантэкстамі, як працэс, што працякае ва ўзаемасувязі са шматлікімі іншымі функцыянальнымі катэгорыямі, уключаючы чытацкую аўдыторыю.

“Марфалогія казкі” У.Пропа – рухавік развіцця асноўных ідэй тэорыі тэксту, пачатак структурнаму вывучэнню апавядальных тэкстаў.

Сістэмны падыход да праблемы інтэртэкстуальнасці ў пісьменніцкай практыцы. Слова (знак) ↔ сказ (знак) ↔ тэкст (знак) ↔ дыскурс (знак).

**2. Дыскурсны падыход да вывучэння тэкстаў (сцэнарый дыскурснага аналізу тэкстаў-навін). Роля сасюраўскай канцэпцыі ў вызначэнні сутнасці дыскурснага падыходу да вывучэння тэксту.**

Дыскурсны падыход і прасвятленне характару сувязей паміж рознымі кагнітыўнымі сістэмамі і ўмовамі паспяховасці маўленчых актаў у канкрэтных сітуацыях. Роля канвенцыяльных ведаў у вызначэнні іншых сістэм, што забяспечваюць камунікацыю (па-за такімі кагнітыўнымі фактарамі, як жаданне, норма і ацэнка). Матывацыя і спосабы інфармацыйнага забеспячэння. Абагульненне і ацэнка (спосаб падачы негатыўнай / пазітыўнай інфармацыі), “прывядзенне прыкладу” (конверсны спосаб падачы інфармацыі, тыповыя выразы), папраўкі (формульная або рытарычная стратэгія), узмацненне (верагодныя ўступкі, спосаб умоўнага абагульнення, тыповыя выразы), лексічныя паўторы (прыцягненне ўвагі і актуалізацыя інфармацыі, падкрэсліванне суб`ектыўных ацэнак, больш значных тэм), кантраст (кагнітыўныя функцыі: рытарычная, семантычная), “змякчэнне” інфармацыі (стратэгія самапрэзентацыі / блакіроўка адмоўных вывадаў), зрух (пазітыўная самапрэзентацыя), ухіленне (рэлевантная / нерэлевантная інфармацыя), прэсупазіцыі, імплікацыі, меркаванні, пабочныя маўленчыя акты (семантычныя і прагматычныя спосабы).

Вывучэнне тэкстаў-навін ў сацыяльна арыентаваным аспекце (*макрасацыялагічны кантэкст, мікрасацыялагічны аналіз літаратурнай дзейнасці, ацэнка сацыяльных і культуралагічных характарыстык сродкаў*

*масавай інфармацыі*) і структурным. Камунікатыўныя індэксы.

**3. Праблема вызначэння зместу тэрміна *дыскурс*, яго структуры і залежнасцей. Ад вывучэння мовы ў сацыяльным кантэксце да дыскурснага аналізу. Семантычная кандэнсацыя як акумулятыўны сродак назапашвання ведаў пра ментальнасць народа.**

Дыскурс і класічныя стратэгіі пабудовы тэксту ў жанравай камбінацыі. Сувязь паміж маўленчымі дзеяннямі *(лакутыўнымі сіламі)*, якія з'яўляюцца носьбітамі пэўных камунікатыўных заданняў *(ілакутыўных сіл)* і накіраваны на дасягненне пэўных эфектаў *(перлакутыўных сіл)*, і сацыяльным вопытам грамадства. "Палітычнае пісьмо".

Узнікненне дыскурс-тэорый, асноўныя напрамкі іх дзеяння: уласналінгвістычны (З. Харыс, Н. Аруцюнава, Э. Бюісанс, Э. Бенвеніст), функцыянальны (стылістычныя спецыфіка плюс эксплііцыраваная за ёй ідэалогія; М. Фуко, А. Грэймас, Ж. Дэрыда, Ю. Крысцева, М. Пешо) і метадалагічны (Ю. Хабермас). Праяўленне дыскурса як: тэксту ў розных яго аспектах (Р. Барт); звязанага маўлення (З. Харыс); актуалізаванага тэксту (ван Дэйк); кагерэнтнага тэксту (І. Белерт); сканструяванага гаворачым тэксту (Д. Браўн, Д. Юл); выніку працэсу ўзаемадзеяння ў сацыякультурным кантэксце (К. Пайк); утварэння, уключанага ў камунікатыўна-прагматычны аспект (І. Сусаў, Н. Аруцюнава); адзінства, што рэалізуецца ў выглядзе маўлення (У. Багданаў); разважання з мэтай знаходжання ісціны (Ю. Хабермас).

Сітуацыя дзяржаўнага білінгвізму, сучасныя тэндэнцыі развіцця мовы. Ізамарфізм рускага элемента ў беларускамоўных публіцыстычных тэкстах.

**4. Агульныя анталагічныя і прыватныя экстралінгвістычныя характарыстыкі публіцыстычнага тэксту**

Асобныя характарыстыкі беларускамоўных тэкстаў СМІ ў звязку з гісторыяй і сучасным станам функцыянавання мовы. Публіцыстычны тэкст: прызначанасць для масавай аўдыторыі і распаўсюджанасць. Экстралінгвістычны фактар дзеяння публіцыстычнага тэксту: аператыўнасць. Перманентнасць публіцыстычнага тэксту: перыядычнасць і рэгулярнасць. Фарміраванне інфармацыйных паводзін. Дубліраванне і вар'іраванне: варыянтна-інварыянтны падыход да сігніфікацыі публіцыстычнага тэксту. "Вытворчы цэх" публіцыстычнага тэксту: аўтарскае "Я" і калектыўнае аўтарства. Экстралінгвістычная матывацыя інтэртэкстуальнага эфекту журналісцкай дзейнасці. Камунікатыўныя зададзенасць і прызначанасць публіцыстычнага тэксту.

**5. Лінгвістычная арганізацыя публіцыстычнага тэксту. Выражэнне моўнай асобы ў тэксце. Трапеічная сістэма мастацкага тэксту ў дачыненні да сацыяльнай дзейнасці носьбіта мовы. Вонкавая і ўнутраная структураванасць публіцыстычнага тэксту.**

Спецыфіка ўзаемаабумоўленых структурна-семантычных, структурна-граматычных сродкаў арганізацыі тэксту. Спосабы і прыёмы пабудовы тэксту, выяўленне і апісанне мікраструктуры – сукупнасці маўленчых адзінак

у адпаведнасці з іх моўнай (верагоднай) рэалізацыяй. Функцыянальны стыль, творчая манера пісьменніка. Камунікатыўныя намеры аўтара, кагнітыўная сутнасць тэксту як сацыялінгвістычнай з'явы.

**6. Парадыгматыка і сінтагматыка публіцыстычнага тэксту. Марфалагічная стратыфікацыя публіцыстычнага тэксту.**

Семасіялагічная сістэма мовы: узровень намінатыўных значэнняў (узровень дэнатата) і узровень імпліцыта. Вобразнасць.

Сінтагматычны аналіз тэксту. Парадыгматычныя здольнасці і сінтагматычная неабходнасць у тэксце. Семная парадыгма слова: аналіз твора У. Караткевіча "Чазенія".

Парадыгматычная здольнасць вербальнага знака. Парадыгматычная струкутурыраванасць тэксту і камунікатыўная дамінанта яго элементаў.

Семантычны аб'ём назоўніка, аддзеяслоўныя назоўнікі. Марфалагічная стратыфікацыя мастацкага і публіцыстычнага тэкстаў.

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## І. ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*

1. Анненкова И.В. Медиадискурс XXI века. Лингвофилософский аспект языка СМИ. – М.: Изд-во Моск. ун-та; Факультет журналистики МГУ имени М.В. Ломоносова, 2011. – 392 с.
2. Барт Р. Нулевая степень письма // Семиотика. – М.:Радуга, 1983.– 636 с.
3. Басава Г.І., Іўчанкаў В.І., Сінькова Л.Д. Святло слова. Дапаможнік па лінгвакультуралогіі. – Мінск: Адукацыі і выхаванне, 2002. – 142 с.
4. Гальперин И.Р. Текст как объект лингвистического исследования. – М.: Наука, 1981. – 140 с.
5. Дейк ван Т. А. Язык. Познание. Коммуникация: Пер. с англ. / Сост. В.В. Петрова; под ред. В.І.Герасимова; Вступ. ст. Ю.Н.Караулова и В.В.Петрова. – М.: Прогресс, 1989. – 312 с.
6. Десюкевич О.И. Терия текста: пособие для студентов Ин-та журналистики БГУ, обучающихся по спец. 1-23 01-02 “Литературная работа (редактирование)” .– Минск: БГУ, 2011. – 132 с.
7. Жаўняровіч П.П. Публіцыстычны дыскурс Уладзіміра Караткевіча; навук. рэд. В.І.Іўчанкаў. – Мінск : РІВШ, 2011. – 244 с.
8. Зелянко С.В. Інтэртэкст у публіцыстычным маўленні; навук. Рэд. В.І.Іўчанкаў, – Мінск: БДУ, 2012. – 195 с.
9. Ивченков В.И. Лингвистическая организация текста. В творческой лаборатории Владимира Короткевича. – Мн.: БГУ, 2002. – 211 с.
10. Ивченков В.И. Лингвостилистика тропов Юрия Казакова. – Мн.: “Пачатковая школа”, 2002. – 112 с.
11. Іўчанкаў В.І. Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту. – Мінск: БДУ, 2003. – 257 с.
12. Солганик Г.Я. Основы лингвистики речи: Учебное пособие. – М. : Издательство Московского университета, 2010. – 128 с.

*Дадатковая*

1. Методология исследований политического дискурса: Актуальные проблемы содержательного анализа общественно-политических текстов / Под общ. ред. И.Ф.Ухвановой-Шмыговой. – Минск: БГУ, 2000. – Вып. 2. – 479 с.
2. Методология исследований политического дискурса: Актуальные проблемы содержательного анализа общественно-политических текстов / Под общ. ред. И.Ф.Ухвановой-Шмыговой. – Минск: БГУ, 2003. – Вып. 3. – 360 с.
3. Мисонжников Б.Я. Феноменология текста (соотношение содержательных и формальных структур печатного издания). – СПб.: Изд-во С.-Петерб. ун-та, 2001. – 490 с.
4. Серажим К. Дискурс як соціолінгвальне явище: методология,

архітектоніка, варіативність [на матеріалах сучасноп газетноп публіцістики]: Монографія. – Київ. нац. ун-т ім. Тараса Шевченка, 2002. – 392 с.
5. Соссюр Ф. Заметки по общей лингвистике: пер. с фр. Общ. ред., вступ. ст. и коммент. Н.А.Слюсаревой. – М.:Прогресс, 1990. – 280 с.
6. Цікоцкі М.Я. Стылістыка тэксту. – Мн.: Беларуская навука, 2002. – 223с.
7. Цікоцкі М.Я.Стылістыка публіцыстычных жанраў. – Мінск: Вышэйшая школа, 1971. – 288 с.

## II. ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДУЕМЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для кантролю якасці адукацыі, у тым ліку пры прымяненні камп'ютарнага тэсціравання, выкарыстоўваюцца наступныя сродкі дыягностыкі:

- тыпавыя заданні;
- тэсты па асобных раздзелах і дысцыпліне ў цэлым;
- пісьмовыя кантрольныя работы;
- вуснае апытанне падчас заняткаў;
- напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;
- выступленне студэнтаў на семінарах;
- падрыхтоўка прэзентацый па асобных раздзелах дысцыпліны;
- вусны экзамен.

## III. КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ:

Для бягучага кантролю ведаў студэнтаў выкарыстоўваецца рэйтынгавая ацэнка ведаў на працягу ўсяго семестра, дзе ўлічваюцца наведванне заняткаў, правядзенне аналізу публіцыстычнага тэксту паводле марфалагічнай стратыфікацыі, актыўнасць на практычных (лекцыйных) занятках і інш.

Прамежкавай формай кантролю засваення ведаў па прадмеце з'яўляецца напісанне рэферата па выбранай тэме (гл. "Прыкладную тэматыку рэфератаў па дысцыпліне "Лінгвістыка публіцыстычнага тэксту").

Асноўнай формай кантролю з'яўляецца экзамен.

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА РЭФЕРАТАЎ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

1. Генезіс і анталагічны статус лінгвістыкі тэксту.
2. Дыскурсны падыход да вывучэння тэкстаў (сцэнарый дыскурснага аналізу тэкстаў-навін).
3. Роля сасюраўскай канцэпцыі ў вызначэнні сутнасці дыскурснага аналізу.
4. Праблема вызначэння зместу тэрміна *дыскурс*, яго структуры і залежнасцей.
5. Ад вывучэння мовы ў сацыяльным кантэксце да дыскурснага аналізу.
6. Семантычная кандэнсацыя як акумулятыўны сродак назапашвання ведаў пра ментальнасць народа.
7. Моўная дывергенцыя і канвергенцыя: уплыў на вытворчасць тэксту.

8. Ізамарфізм рускага элемента ў беларускамоўных тэкстах.
9. Агульныя анталагічныя і прыватныя экстралінгвістычныя характарыстыкі тэксту.
10. Экстралінгвістычная матывацыя інтэртэкстуальнага эфекту.
11. Выражэнне моўнай асобы ў тэксце.
12. Трапеічная сістэма мастацкага тэксту ў дачыненні да сацыяльнай дзейнасці носьбіта мовы.
13. Вонкавая і ўнутраная структурыраванасць публіцыстычнага тэксту.
14. Парадыгматыка і сінтагматыка тэксту.
15. Парадыгматычная здольнасць вербальнага знака ў публіцыстычным тэксце.
16. Парадыгматычная струкутурыраванасць тэксту і камунікатыўная дамінанта аднаго з яго элементаў.
17. Сінтагматыка публіцыстычнага тэксту.
18. Марфалагічная стратыфікацыя тэксту.
19. "Падзейнасць" публіцыстычнага тэксту: рэальнасць / ірэальнасць.
20. Інтэрпрэтацыя публіцыстычнага тэксту як дыскурса. Канцэпты "чалавека" як сукупнай моўнай асобы.
21. Складнікі публіцыстычнага тэксту: тэма, топік, фрэйм.
22. Фрэймавыя структуры як прэзентацыя эпізадычнай памяці.
23. Дыскурсны аналіз у лінгвістыцы публіцыстычнага тэксту.
24. Прагма-кагнітыўны аналіз публіцыстычнага тэксту як дыскурса.
25. Лакутыўна-ілакутыўна-перлакутыўны працэс у арганізацыі публіцыстычнага тэксту.

## IV. ПРЫКЛАДНЫЯ ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНУ

1. Тэкст. Тэорыя тэксту і лінгвістыка тэксту. Дэфінітыўны апарат апрацоўкі тэксту ў лінгвістычных сферах.
2. Станаўленне і развіццё лінгвістыкі публіцыстычнага тэксту – важны гістарычны працэс, які патрабуе абагульнення назапашаных ведаў, цэласнага аналізу асобных з'яў журналістыкі і лінгвістыкі.
3. Новы падыход да прадукта разумовай дзейнасці чалавека – тэксту: структурнае распазнаванне яго элементаў, кампаноўкі і сістэмнае ўзаемадзеянне вербальнага знака з іншымі знакамі натуральнага свету, вызначэнне прыроды такога ўзаемадзеяння.
4. Тэкст як з'ява чалавечай дзейнасці, камунікацыі і пазнання.
5. Тэкставая дзейнасць журналіста. Журналісцкі тэкст: інфармацыйныя і публіцыстычны тэксты. PR-тэксты.
6. Вербальны тэкст у рэальным камунікатыўным дзеянні, у інтэграцыі з сацыяльна-культурнымі і ідэалагічнымі кантэкстамі, як працэс, што працякае ва ўзаемасувязі са шматлікімі іншымі функцыянальнымі катэгорыямі, уключаючы чытальніцкую аўдыторыю.

7. “Марфалогія казкі” У. Пропа – рухавік развіцця асноўных ідэй тэорыі тэксту, пачатак структурнаму вывучэнню апавядальных тэкстаў.

8. Сістэмны падыход да праблемы інтэртэкстуальнасці ў журналісцкай практыцы. Слова (знак) ↔ сказ (знак) ↔ тэкст (знак) ↔ дыскурс (знак).

9. Дыскурсны падыход да вывучэння тэкстаў (сцэнарый дыскурснага аналізу тэкстаў-навін).

10. Роля сасюраўскай канцэпцыі ў вызначэнні сутнасці дыскурснага падыходу да вывучэння тэксту.

11. Асобныя характарыстыкі беларускамоўных тэкстаў СМІ ў звязку з гісторыяй і сучасным станам функцыянавання мовы.

12. Дыскурсны падыход і прасвятленне характару сувязей паміж рознымі кагнітыўнымі сістэмамі і ўмовамі паспяховасці маўленчых актаў у канкрэтных сітуацыях.

13. Роля канвенцыяльных ведаў у вызначэнні сістэм, што забяспечваюць камунікацыю (па-за такіх кагнітыўных фактараў, як жаданне, норма і ацэнка).

14. Матывацыя і спосабы інфармацыйнага забеспячэння.

15. Вывучэнне тэкстаў-навін ў сацыяльна арыентаваным аспекце (*макрасацыялагічны кантэкст, мікрасацыялагічны аналіз журналісцкай дзейнасці, ацэнка сацыяльных і культуралагічных характарыстык сродкаў масавай інфармацыі*) і структурным. Камунікатыўныя індэксы.

16. Праблема вызначэння зместу тэрміна *дыскурс*, яго структуры і залежнасцей.

17. Ад вывучэння мовы ў сацыяльным кантэксце да дыскурснага аналізу.

18. Семантычная кандэнсацыя як акумулятыўны сродак назапашвання ведаў пра ментальнасць народа.

19. Дыскурс і класічныя стратэгіі пабудовы тэксту ў жанравай камбінацыі сфер палітыкі і права, мастацкай літаратуры.

20. Сувязь паміж маўленчымі дзеяннямі *(лакутыўнымі сіламі)*, якія з'яўляюцца носьбітамі пэўных камунікатыўных заданняў *(ілакутыўных сіл)* і накіраваны на дасягненне пэўных эфектаў *(перлакутыўных сіл)*, і сацыяльным вопытам грамадства. “Палітычнае пісьмо”.

21. Моўная дывергенцыя і канвергенцыя: уплыў на вытворчасць публіцыстычнага тэксту.

22. Ізамарфізм рускага элемента ў беларускамоўных тэкстах СМІ

23. Узнікненне дыскурс-тэорый, асноўныя напрамкі іх дзеяння: уласналінгвістычны (З. Харыс, Н. Аруцюнава, Э. Бюісанс, Э. Бенвеніст), функцыянальны (стылістычныя спецыфіка плюс эксплiцыраваная за ёй ідэалогія; М. Фуко, А. Грэймас, Ж. Дэрыд, Ю. Крысцева, М. Пешо) і метадалагічны (Ю. Хабермас).

24. Праяўленне дыскурса як: тэксту ў розных яго аспектах (Р. Барт); звязанага маўлення (З. Харыс); актуалізаванага тэксту (ван Дэйк); кагерэнтнага тэксту (І. Белерт); сканструяванага гаворачым тэксту (Д. Браун, Д. Юл); выніку працэсу ўзаемадзеяння ў сацыякультурным кантэксце (К. Пайк); утварэння, уключанага ў камунікатыўна-прагматычны аспект

(І. Сусаў, Н. Аруцюнава); адзінства, што рэалізуецца ў выглядзе маўлення (У. Багданаў); разважання з мэтай знаходжання ісціны (Й. Хабермас).

25. Сітуацыя дзяржаўнага білінгвізму, сучасныя тэндэнцыі развіцця мовы. Ізамарфізм рускага элемента ў беларускамоўных тэкстах.

26. Публіцыстычны тэкст: прызначанасць для масавай аўдыторыі і распаўсюджанасць.

27. Экстралінгвістычны фактар дзеяння публіцыстычнага тэксту: аператыўнасць.

28. Перманентнасць публіцыстычнага тэксту: перыядычнасць і рэгулярнасць. Фарміраванне інфармацыйных паводзін.

29. Дубліраванне і вар'іраванне: варыянтна-інварыянтны падыход да сігніфікацыі публіцыстычнага тэксту.

30. "Вытворчы цэх" публіцыстычнага тэксту: аўтарскае "Я" і калектыўнае аўтарства.

31. Экстралінгвістычная матывацыя інтэртэкстуальнага эфекту журналісцкай дзейнасці.

32. Камунікатыўныя зададзенасць і прызначанасць публіцыстычнага тэксту.

33. Лінгвістычная арганізацыя публіцыстычнага тэксту.

34. Выражэнне моўнай асобы ў тэксце.

35. Трапеічная сістэма мастацкага тэксту ў дачыненні да сацыяльнай дзейнасці носьбіта мовы.

36. Вонкавая і ўнутраная структурыраванасць публіцыстычнага тэксту.

37. Парадыгматыка і сінтагматыка публіцыстычнага тэксту.

38. Спецыфіка ўзаемаабумоўленых структурна-семантычных, структурна-граматычных сродкаў арганізацыі тэксту.

39. Спосабы і прыёмы пабудовы тэксту, выяўленне і апісанне мікраструктуры – сукупнасці маўленчых адзінак у адпаведнасці з іх моўнай (верагоднай) рэалізацыяй.

40. Функцыянальны стыль, творчая манера пісьменніка.

41. Камунікатыўныя намеры аўтара, кагнітыўная сутнасць тэксту як сацыялінгвістычнай з'явы.

42. Семасіялагічная сістэма мовы: узровень намінатыўных значэнняў (узровень дэнатата) і узровень імпліцыта. Вобразнасць.

43. Сінтагматычны аналіз тэксту. Парадыгматычныя здольнасці і сінтагматычная неабходнасць у тэксце.

44. Семная парадыгма слова: аналіз твора У. Караткевіча "Чазенія".

45. Парадыгматычная здольнасць вербальнага знака.

46. Парадыгматычная структурыраванасць тэксту і камунікатыўная дамінанта яго элементаў.

47. Семантычны аб'ём назоўніка, праблема ўжывання аддзеяслоўных назоўнікаў у тэкстах СМІ.

48. Марфалагічная стратыфікацыя публіцыстычнага тэксту.